МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

Факультет педагогики и психологии БарГУ

# СПЕЦИАЛИСТ XXI ВЕКА

## Материалы III Международной научно-практической конференции, посвящённой 10-летию со дня образования университета

**4—5 июня 2014 г.**
**г. Барановичи**
**Республика Беларусь**

**В 2 книгах**
**Книга 1**

Барановичи
РИО БарГУ
2014

Репозиторий БарГУ

УДК 001(063)
ББК 72я73
С71

Рекомендовано к печати редакционно-издательским советом учреждения образования
«Барановичский государственный университет»

Р е ц е н з е н т ы:

*Ю. А. Коломейцев,* доктор психологических наук, профессор, профессор кафедры психологии управления Академии управления при Президенте Республики Беларусь (Минск, Республика Беларусь);
*Л. А. Козинец,* кандидат педагогических наук, доцент, доцент кафедры педагогики учреждения образования «Белорусский государственный педагогический университет им. М. Танка» (Минск, Республика Беларусь)

Р е д а к ц и о н н а я к о л л е г и я:

*А. В. Никишова* (гл. ред.), *А. А. Селезнёв* (отв. ред.), *О. В. Белановская, А. В. Демидович, Н. Г. Дубешко, А. В. Земоглядчук, В. И. Козел, А. В. Литвинский, Д. С. Лундышев, Ж. Б. Манкевич, Н. М. Плескацевич, К. С. Тристень*

Репозиторий БарГУ

С71 **Специалист XXI века** [Текст] : материалы III Междунар. науч.-практ. конф., посвящённой 10-летию со дня образования ун-та, 4—5 июня 2014 г., г. Барановичи, Респ. Беларусь : в 2 кн. / редкол.: А. В. Никишова (гл. ред.), А. А. Селезнёв (отв. ред.) [и др.]. — Барановичи : РИО БарГУ, 2014. — Кн. 1. — 268, [2] с. — 160 экз.

ISBN 978-985-498-580-0
ISBN 978-985-498-581-7 (Книга 1)

Включены доклады по различным научным дисциплинам и направлениям психологии и педагогики: аспекты формирования педагогической культуры будущего специалиста, организация здоровьесбережения, условия профессионального образования специалиста-психолога.

Адресуется преподавателям и студентам учреждений высшего образования, магистрантам, аспирантам.

**УДК 001(063)**
**ББК 72я73**

**ISBN 978-985-498-580-0**
**ISBN 978-985-498-581-7 (Книга 1)**

© Коллектив авторов, 2014
© БарГУ, 2014
© Сидоренко А. Ю., художественное оформление обложки, 2014

иностранных граждан, путешествующих по Беларуси, которые отмечали, что среди белорусов были редкостью тяжёлые преступления против личности и общества.

Национальный характер, менталитет проявляется и в жизнедеятельности людей: в труде, в поведении, обществе, семье и т. д. Он находит своё отражение во всех видах и формах культуры, в искусстве народа — художественных образах народной поэзии, произведениях литературы, песнях, музыке, танцах, произведениях прикладного искусства.

Современные трансформационные процессы на постсоветском пространстве оказали серьёзное влияние на мировосприятие человека, его отношение к себе и миру. В целях изучения национальной идентичности представителей белорусского этноса нами было проведено исследование. В качестве респондентов выступили студенты III курса факультета педагогики и психологии БарГУ в количестве 100 человек. На вопрос «С какой национальностью вы себя соотносите?» абсолютное большинство опрошенных (95,3%) дали ответ, что относят себя к белорусам. По мнению студентов, наиболее типичными качествами белорусов являются гостеприимство, трудолюбие, нерешительность, медлительность, толерантность, доброжелательность, терпеливость, отзывчивость, ответственность. Позитивными качествами белорусов студенты считают дружелюбность, толерантность, доброту, гостеприимство, трудолюбие, честность, уважительность, вежливость. Практически все эти свойства характера студенты отметили и у себя. К числу отрицательных характеристик белорусского этноса респонденты отнесли нерасторопность, медлительность, пассивность, нерешительность, лень, трусость, грубость, зависть, алкоголизм, «слишком добрые», несправедливость. В этом случае из перечисленных характеристик студенты обнаружили у себя пассивность, нерешительность, лень, зависть. Среди факторов, оказавших влияние на формирование белорусского национального характера, студентами были отмечены следующие: влияние других государств, природно-климатические условия, религия, геополитическое положение нашей страны и т. д. Большинство опрошенных (58,1%) считают, что для белорусов характерно «коллективное начало», 41,8% респондентов считают белорусов индивидуалистами. Интересен тот факт, что примерно в такой же пропорции (53,6% и 44,2%) студенты соотнесли и себя с этими характеристиками. Причины сохранения стабильной политической и социально-экономической ситуации в Беларуси студенты видят в особенностях национального характера белорусов (28%), взвешенной и продуманной политике со стороны государственных органов (27%), отсутствии коррупции (9%), других причинах (14%). На вопрос «В какой области, по вашему мнению, белорусы могут заявить о себе в мировом пространстве?» ответы распределились следующим образом: культура (31%), спорт (25%), политика (5%), наука (4%), другие сферы (4%).

**Заключение.** Проведённое исследование показало, что студенты осознают свою принадлежность к белорусскому этносу, определяют его типичные черты, выделяют их в собственном менталитете, высказывают прогнозы относительно перспектив развития белорусской нации в будущем. Вселяет оптимизм то обстоятельство, что молодые люди считают культуру одной из важнейших сфер, посредством которой белорусы могут заявить о себе миру. Таким образом, сохранение своих ментальных характеристик, своей «самости» не только позволит синтезировать и передать будущим поколениям наилучшие духовные традиции белорусского этноса, но и обогатит мировую культуру и цивилизацию.

**Список цитируемых источников**

1. *Романов, О.* От чистого истока — в прекрасное далеко / О. Романов // Беларус. думка. — 2013 — № 12. — С. 93—101.
2. *Василенко, И. А.* Политическая философия : учеб. пособие / И. А. Василенко. — 2-е изд. — М. : ИНФРА-М, 2010. — 320 с.
3. *Кириенко, В. В.* Белорусская ментальность: истоки, современность, перспективы / В. В. Кириенко. — Гомель : ГГТУ им. П. О. Сухого, 2009. — 319 с.
4. *Смолич, А. А.* География Беларуси / А. А. Смолич. — 4-е изд. — Минск. : Навука і тэхніка, 1993. — 374 с.

Материал поступил в редакцию 24.02.2014 г.

**УДК 930.1**

***А. У. Літвінскі,*** кандыдат гістарычных навук
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы

## ЗАХОДНЕРУСІЗМ ЯК ФАКТАР ГІСТАРЫЧНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

**Уводзіны.** Як фактар нацыянальна-гістарычнай самасвядомасці, заходнерусізм дагэтуль аказвае пэўны ўплыў на працэсы выхавання і сацыялізацыі беларускай моладзі, і таму патрабуе разгляду ў кантэксце падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў розных галін жыццядзейнасці, перад якімі XXI стагоддзе адкрывае прывабныя перспектывы. Неабходнасць такога разгляду тлумачыцца

Репозиторий БарГУ

тым, што толькі аб’ектыўныя веды аб беларускай мінуўшчыне, якія вытрымалі навуковую верыфікацыю, садзейнічаюць эфектыўнасці працэсу фарміравання светапогляду і каштоўнасных арыентацый моладзі, перш за ўсё грамадзянскасці, патрыятызму і сацыяльнай адказнасці асобы перад сучаснікамі, а таксама будучымі пакаленнямі.

Праблема ўплыву заходнерусізму на развіццё беларускай гістарычнай думкі яшчэ не ў дастатковым аб’ёме распрацавана даследчыкамі ў галіне гістарыяграфіі. У большасці выпадкаў справа абмяжоўваецца наяўнасцю шэрагу заўваг агульнага характару. Таму даследаванне дадзенай праблематыкі мае не толькі грамадска-палітычную і адукацыйна-педагагічную, але і навукова-гістарычную актуальнасць.

У артыкуле сцісла характарызуюцца асноўныя рысы заходнерусізму як ідэалогіі і навукова-гістарычнай плыні, звяртаецца ўвага на светапоглядныя, сацыяльна-палітычныя і навуковыя пазіцыі прадстаўнікоў гэтай плыні, аналізуецца ўплыў заходнерусізму на развіццё беларускай гістарычнай навукі ў розныя перыяды, выказваецца меркаванне аб прычынах і асаблівасцях такога ўплыву і яго наступствах у кантэксце функцыянавання беларускай нацыянальна-гістарычнай самасвядомасці.

У працэсе падрыхтоўкі дадзенага артыкула аўтар кіраваўся метадалагічнымі прынцыпамі аб’ектыўнасці і гістарызму, выкарыстоўваў метады параўнальна-гістарычнага і структурна-функцыянальнага аналізу. Крыніцазнаўчую базу даследавання склалі асноўныя гістарычныя працы прыхільнікаў заходнерусізму, а таксама працы гісторыкаў наступных пакаленняў, у якіх з большай альбо меншай ступенню выяўлення прысутнічае ідэйны кантэкст заходнерусісцкай канцэпцыі гісторыі Беларусі.

**Асноўная частка.** Заходнерусізм — уплывовы накірунак грамадска-палітычнай і навукова-гістарычнай думкі Беларусі і Расіі, які ў сваім класічным выглядзе існаваў на працягу XIX — першай паловы XX стагоддзя. Яго галоўным тэзісам было адмаўленне існавання беларускага народа ў якасці самастойнага, адрознага ад вялікарусаў, творцы сваёй гісторыі і будучыні. Самае большае, на што былі згодныя заходнерусісты на чале з М. В. Каяловічам (вядомым у свой час гісторыкам, прафесарам Пецярбургскай духоўнай акадэміі), — гэта прызнанне беларусаў толькі ў якасці часткі адзінага рускага народа, часткі, якая мае пэўныя этнаграфічныя асаблівасці. На думку А. Цвікевіча, першага даследчыка заходнерусізму як грамадска-палітычнага феномену, сам М. В. Каяловіч вагаўся паміж «зліццём у вялікарускасці», якое фактычна не пакідала месца беларускай нацыі ў будучыні, і «этнаграфічна-краёвым пунктам гледжання» на Беларусь [1, с. 229].

Тэзіс аб беларусах як аб частцы адзінага рускага народа, грунтаваўся ў заходнерусістаў на прызнанні праваслаўя ў якасці духоўнай асновы ўсходнеславянскага адзінства. Зразумела, што ўсё каталіцкае і польскае ацэньвалася пры такім падыходзе адмоўна. Не ў апошнюю чаргу гэта тлумачыцца тым, што заходнерусізм узнік як ідэалогія своеасаблівага сацыяльнага і канфесійнага рэваншу. Шмат хто з актыўных заходнерусістаў першага пакалення паходзіў з уніяцкага асяроддзя. Яны добра ведалі аб «плебейскім», у пэўнай ступені прыніжаным статусе грэка-каталіцкай царквы ў параўнанні з рымска-каталіцкай, статусе, які трывала захоўваўся амаль на працягу ўсяго існавання Рэчы Паспалітай. Праўда, меркаванні дваранскай салідарнасці для царызму доўгі час былі важнейшымі за вернападданніцтва разначынцаў-«западноруссов», паколькі польскае памешчыцкае землеўладанне істотна не абмяжоўвалася, а пасады займалі дваране, якія з’яўляліся ўраджэнцамі ўнутраных губерняў Расіі [1, с. 278—284]. І толькі ў перыяд актыўнай палітычнай дзейнасці П. А. Сталыпіна — рашучага прыхільніка русіфікацыі Беларусі — кіруючыя колы імперыі павярнуліся тварам да ідэйных нашчадкаў М. В. Каяловіча [1, с. 299—310].

У пачатку XX стагоддзя заходнерусізм як з’ява гістарычнай навукі пастуова, нягледзячы на падтрымку з боку ўрада імператарскай Расіі, стаў здаваць свае пазіцыі ў параўнанні з расійскай гістарыяграфіяй ліберальнага накірунку. Аднак у якасці фактара гістарычнай самасвядомасці і этнакультурнай самаідэнтыфікацыі беларусаў дадзеная плынь грамадска-палітычнай і навукова-гістарычнай думкі аказала відавочны ўплыў на далейшае гістарычнае развіццё Беларусі. Можна пагадзіцца са сцвярджэннем польскіх гісторыкаў беларускага этнічнага паходжання А. Латышонка і Я. Мірановіча аб тым, што на працягу XIX—XX стагоддзяў адбылася цывілізацыйная пераарыентацыя Беларусі з Польшчы на Расію [2, с. 14—15]. Безумоўна, заходнерусізм як ідэалогія, увасобленая ў гістарычных працах, спрычыніўся да гэтага працэсу.

Не такія простыя, як здаецца на першы погляд, былі адносіны беларускага нацыянальнага руху да творчай спадчыны М. В. Каяловіча і яго паслядоўнікаў. Так, у пачатку XX стагоддзя заходнерусізм выступаў як непрымірымы апанент «нашаніўскага» руху. Нездарма разгарнулася вострая палеміка паміж лідарам новага пакалення заходнерусістаў Л. М. Саланевічам і Я. Купалам, які пэўны час быў рэдактарам «Нашай нівы».

Абапіраючыся на падтрымку аднадумцаў П. А. Сталыпіна, Л. М. Саланевіч разгарнуў актыўную дзейнасць па «нейтралізацыі штучнага беларускага сепаратызму, які мог бы ўвагнаць клін паміж двума плямёнамі аднаго і таго ж народа і пасеяць паміж імі варожасць» (тут і далей у цытатах пераклад з рускай мовы наш. — ***А. Л.***) [3, с. 29].

У якасці барацьбіта з «беларускім сепаратызмам» Л. М. Саланевіч даўся ў знакі многім прыхільнікам справы беларускага нацыянальна-культурнага Адраджэння. У артыкуле «За “А ўсё ж такі мы жывём!..”», апублікаваным на старонках «Нашай Нівы» у 1914 годзе, Купала, адказваючы на публіцыстычныя

Рэпазіторый БарДУ

інвектывы Саланевіча, параўнаў таго з «совамі і начніцамі» і назваў «перакінчыкам» [4, с. 546]. Палемізуючы са сваім апанентам, ён выказаў шчырае спадзяванне на тое, што «беларус добра патрапіць раскумекаць, хто і як да яго гаворыць і хто яму болей родны і вечны, а хто чужы і дачасны» [4, с. 546].

Аднак не варта забывацца на тое, што «мадэрная беларуская нацыя ўзнікла на мяжы XIX і XX стагоддзяў як еўрапейская нацыя свабодных вытворцаў — сялян» [2, с. 14]. Іншымі словамі, ад пачатку яна фарміравалася як плебейская, «мужыцкая» нацыя. Таму і не дзіўна, што ў беларускай мастацкай літаратуры «нашаніўскага перыяду» так апантана адстойваліся эгалітарныя ідэі, а першая беларуская нацыянальная партыя мела назву спачатку «Беларуская рэвалюцыйная грамада», а потым «Беларуская сацыялістычная грамада». А як вядома, у сацыяльным плане своеасаблівым антыподам «мужыка-беларуса» быў «пан-паляк». Гэткі, сацыяльна завостраны, варыянт самаідэнтыфікацыі дыктаваў шмат каму з дзеячаў беларускага нацыянальнага руху неабходнасць насцярожанага стаўлення да праяў «польскасці», што парадаксальным чынам збліжала іх погляды, хоць у некаторай ступені, з поглядамі памяркоўных заходнерусістаў. Ва ўсялякім разе, тыя прыхільнікі беларускага нацыянальнага руху, што стваралі працы па гісторыі, раз-пораз выказвалі думкі, якія сустракаліся ў М. В. Каяловіча і яго паслядоўнікаў. Мы далёкія ад таго, каб тлумачыць дадзеную з’яву непасрэдным уплывам заходнерусісцкай гістарыяграфічнай школы, аднак пэўная пераклічка ідэй і меркаванняў усё ж такі назіраецца.

Пакінем па-за разглядам «Кароткую гісторыю Беларусі» В. Ластоўскага, занадта, на нашу думку, скараспелую і канспектыўную. Звернемся да больш грунтоўнага «Кароткага нарысу гісторыі Беларусі» У. М. Ігнатоўскага [6]. Да прыкладу, па пытанні аб «этнічнай прыналежнасці Вялікага Княства Літоўскага» (далей — ВКЛ) (пры ўсёй умоўнасці і спрэчнасці гэтага словазлучэння) У. М. Ігнатоўскі фактычна паўтарае тэзіс М. В. Каяловіча і яго аднадумцаў, паводле якога ВКЛ з’явілася вынікам узаемадзеяння літоўскага і славянскага пачаткаў (дзеля параўнання можна звярнуцца да іншых крыніц: [6, с. 91; 7, с. 91; 3, с. 6, 8] і [5, с. 73, 81]). Трэба, аднак, заўважыць, што ВКЛ было для М. В. Каяловіча літоўска-рускай дзяржавай, а для У. М. Ігнатоўскага — літоўска-беларускім гаспадарствам [5, с. 73].

У. М. Ігнатоўскі, хаця і з пэўнымі агаворкамі, скептычна ставіцца да Люблінскай міждзяржаўнай уніі 1569 года і Берасцейскай міжцаркоўнай уніі 1596 года. У адносінах да першай з іх ён сцвярджаў: «Вунія была эгаістычнай з боку Польшчы. <...> Беларусь ...увайшла ў дзяржаўны арганізм такога гаспадарства, каторае ўжо пачало хварэць і палітычна, і сацыяльна. <...> З культурнага боку Беларусь таксама прайграла, бо польскі культурны ўплыў адарваў ад народу вышэйшыя станы, якія, апалячыўшыся, сталі чужымі для свайго народу як культурная сіла» [5, с. 115]. Гэты тэзіс у свой час (праўда ў адносінах да «Западной России») паслядоўна адстойвалі і гісторыкі-заходнерусісты.

Яшчэ больш падабенства паміж пазіцыяй прадстаўнікоў заходнерусізма ў гістарыяграфіі і пазіцыяй У. М. Ігнатоўскага па пытанні аб ролі ўніяцкай царквы ў гісторыі Беларусі. М. В. Каяловіч падкрэсліваў, што Берасцейская ўнія «засноўвалася на падступнасці і ашуканстве» [8, I, с. 128], паколькі была «сагрэтая лацінскім езуіцкім фанатызмам — адным з самых жорсткіх відаў рэлігійнага фанатызму» [8, II, с. 1]. Па сутнасці, У. М. Ігнатоўскі на працягу шэрагу старонак сваёй працы ілюструе гэты тэзіс [5, с. 116—125].

М. В. Доўнар-Запольскі ў сваёй «Гісторыі Беларусі», дарэчы, не апублікаванай адразу пасля напісання з-за неадпаведнасці панаваўшай у СССР у 20-я гады XX стагоддзя ідэалогіі [9, с. 497—506], прытрымліваўся шмат ў чым іншых, у параўнанні з гісторыкамі-заходнерусістамі, пазіцый. Але характэрна, што дзейнасці М. В. Каяловіча ён даў у цэлым высокую ацэнку, падкрэсліваючы «глыбокі патрыятызм, глыбокае пачуццё любві да роднай Беларусі» прафесара Пецярбургскай духоўнай акадэміі. «Ва ўсялякім выпадку, Каяловіч быў буйным дзеячам, які сваімі поглядамі упрыгожваў цэлы перыяд», — сцвярджаў М. В. Доўнар-Запольскі, хаця і адносіў М. В. Каяловіча, як і іншых заходнерусістаў, да «афіцыйнага кірунку» [9. с. 370]. У чымсьці падобную ацэнку дзейнасці М. В. Каяловіча мы можам знайсці ў сучаснага гісторыка А. Латышонка, які не бачыць падстаў для адназначна адмоўнай ацэнкі заходнерусізму [10, с. 403—404].

Складанае пытанне аб уплыве заходнерусісцкай гістарыяграфічнай традыцыі на савецкую гістарыяграфію гісторыі Беларусі. Зразумела, і ў дадзеным выпадку не варта сцвярджаць аб тым, што гэты ўплыў быў непасрэдны — занадта адрозніваліся светапоглядныя пазіцыі славянафілаў-заходнерусістаў і савецкіх гісторыкаў, якія прытрымліваліся ідэалогіі марксізму-ленінізму. Аднак не будзе навіною для дасведчанага чытача тое, што дзесьці з другой паловы 30-х гадоў XX стагоддзя савецкі варыянт марксізму быў дапоўнены ідэяй, паводле якой СССР з’яўляўся, хаця б у пэўнай ступені, працягам традыцый рускай і расійскай дзяржаўнасці. Вось тут і спатрэбіліся напрацоўкі гістарыяграфічнай школы, прадстаўнікі якой у свой час засведчылі вернасць заходнерусізму. Безумоўна, гэтыя напрацоўкі не маглі быць прынятыя ў «класічным» выглядзе савецкай гістарычнай навукай, і таму адбылася іх пэўная мадэрнізацыя.

У найбольшай ступені савецкая гістарыяграфія выкарыстоўвала пастулат заходнерусістаў аб перыядзе існавання Рэчы Паспалітай як часе заняпаду Беларусі [6, с. 376]. Яна амаль цалкам падзяляла погляд М. В. Каяловіча аб заганным уплыве Польшчы на «заходнерускія» землі, які нарастаў з часоў Крэўскай уніі [11, с. 141—147].



Рэпазітарый БДПУ

Як і заходнерусісты, савецкія гісторыкі вельмі адмоўна ставіліся да каталіцызму. Гэтая рэлігія заўжды лічылася ў Савецкім Саюзе чужой і небяспечнай. У шмат чым палітычная кан'юнктура заахвочвала навукоўцаў да стварэння надта ўжо негатыўнага вобразу каталіцызму. Пры гэтым яны, ацэньваючы мінулае беларускага народа, асцярожна, паколькі дзяржава была атэістычнай, але ўсё ж аддавалі перавагу праваслаўю.

Цалкам лагічна, што гісторыкі-заходнерусісты, у адпаведнасці са сваёй канцэпцыяй, горача віталі далучэнне зямель Беларусі, Украіны, «Заходняй Расіі», па іх тэрміналогіі, да Расійскай імперыі і лічылі гэтую падзею паваротнай у гісторыі рэгіёна. Жыхары Беларусі сярэдняга і сталага ўзросту, якія калісьці вучыліся ў савецкіх школах і цікавіліся навукай аб мінулым, павінны выдатна памятаць, што ў школьных падручніках падзелы Рэчы Паспалітай ацэньваліся са станоўчага пункту гледжання, паколькі забяспечвалі ўз'яднанне Беларусі з Расіяй. Падабенства канцэптуальных пазіцый славянафільскай гістарыіграфіі з панаваўшай у савецкай гістарычнай навуцы сістэмай поглядаў па дадзеным пытанні не выклікае сумнення, хаця аргументацыя была рознай (не маглі ж навукоўцы-марксісты бачыць станоўчы сэнс у вяртанні дамінавання праваслаўя, як тое рабілі славянафілы).

Такім чынам, савецкая гістарычная навука, дэкларуючы адмоўныя адносіны да славянафільскай па ідэалагічным паходжанні гістарыяграфіі, у пэўнай ступені, спакваля выкарыстоўвала яе навуковыя напрацоўкі. Прынамсі, назіраецца пераемнасць паміж заходнерусісцкай і афіцыйнай савецкай гістарыяграфіяй у адносінах да важнейшых аспектаў навукова-гістарычных канцэпцый, якія асвятляюць мінулае Беларусі.

Існавалі, безумоўна, і значныя адрозненні паміж заходнерусісцкай гістарыяграфічнай традыцыяй і напрацоўкамі савецкай гістарычнай навукі. Галоўным з іх, на наш погляд, была розная інтэрпрэтацыя ролі і месца ВКЛ ў мінуўшчыне беларусаў і украінцаў. Навукоўцы, што належалі да створанай М. В. Каяловічам школы, досыць паслядоўна падкрэслівалі «літоўска-рускі» характар ВКЛ. Напрыклад, Л. М. Саланевіч сцвярджаў, што «Літва пакрысе рабілася рускай», таму што літоўцы «запазычылі ад рускіх іх норавы і звычаі, рускую мову, рускае пісьменства і іх праваслаўную веру» [3, с. 8].

Акцэнт на «рускасці» ВКЛ у дадзеным выпадку рабіўся яшчэ і для таго, каб абвергнуць як неабгрунтаваныя прэтэнзіі палякаў на нейкую цывілізатарскую ролю у адносінах да зямель Беларусі, Украіны, ды і самой Літвы. А вось для савецкіх ідэолагаў, калі размову весці толькі пра Беларусь, бадай што больш важным было супрацьстаянне беларускаму нацыяналізму, і таму ў якасці фактычна афіцыйнага быў прыняты пастулат аб тым, што ВКЛ з'яўлялася літоўскай дзяржавай у сучасным разуменні гэтага выразу.

У наш час заходнерусісцкія ідэі з'яўляюцца папулярнымі сярод часткі інтэлектуалаў, якія непарыўна звязваюць сябе з праваслаўем, і, адпаведным чынам, у змаганні праваслаўя супраць каталіцызму бачаць дамінанту беларускай гісторыі, а ў пэўным сэнсе слова, і сучаснасці таксама [12, с. 8]. Другі варыянт захавання некаторых элементаў заходнерусісцкай гістарыяграфічнай традыцыі у спалучэнні з напрацоўкамі савецкай гістарыяграфіі у найбольшай ступені, на наш погляд, быў рэалізаваны на старонках падручніка па гісторыі Беларусі для ўстаноў вышэйшай адукацыі пад рэдакцыяй Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля [13].

**Заключэнне.** Падводзячы вынікі, трэба адзначыць, што заходнерусізм аказаў прыкметнае ўздзеянне на гістарычную самасвядомасць беларусаў. Праўда, можна сцвярджаць, што на самасвядомасць большай часткі насельніцтва Беларусі савецкага і, часткова, постсавецкага перыяду паўплываў не столькі заходнерусізм у яго класічным выглядзе, колькі своеасаблівы гібрыд марксізму, у савецкім яго разуменні, і рэанімiраванай у сталінскія часы ідэі расійскай вялікадзяржаўнасці. Адпаведным чынам, вельмі распаўсюджаным стаў тып беларуса з паніжаным узроўнем усведамлення ўласнай гістарычнай суб'ектнасці.

Калі ж весці размову пра дзеячаў беларускага нацыянальнага руху, то ў дадзеным выпадку неабходна падкрэсліць, што палітычную праграму заходнерусістаў, асабліва ў інтэрпрэтацыі Л. М. Саланевіча, гэтыя дзеячы рашуча адкінулі як абсалютна непрыдатную для справы самавызначэння беларусаў, паколькі гэтая праграма у рэшце рэшт зводзілася да тэзіса аб немагчымасці для беларусаў існаваць самастойна, без расійскага апякунства.

З іншага боку, тыя напрацоўкі заходнерусісцкай гістарыяграфіі, якія, у пэўнай ступені, аб'ектыўна адпавядалі задачам фарміравання беларускай нацыянальнай самасвядомасці, былі актуалізаваныя, няхай сабе ў мадэрнізаванай форме, прадстаўнікамі беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі (напрыклад, асцярожна-станоўчая ацэнка ВКЛ, акцэнт на значнай ролі ў ім усходніх славян, адмоўнае стаўленне да паланізацыі і да прэтэнзій Польшчы на ўсходнеславянскія землі).

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Цвікевіч, А. Г.* «Западноруссизм»: нарысы з гісторыі і грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. / А. Г. Цвікевіч. — Мн. : Навука і тэхніка, 1993. — 347 с.

2. *Латышонак, А.* Гісторыя Беларусі ад сярэдзіны XVIII ст. да пачатку XXI ст. / А. Латышонак, Я. Мірановіч. — Вільня : Інт беларусістыкі, 2010. — 368 с.

3. *Солоневич, Л. М.* Краткий исторический очерк Гродненской губернии за сто лет её существования, 1802—1902 гг. / Л. М. Солоневич. — Гродно : [б. и.], 1901. — 106 с.

4. *Купала, Я.* Выбраныя творы / Я. Купала. — Мн. : Беларус. кнігазбор, 2002. — 640 с.

Репозиторий БарГУ

5. *Ігнатоўскі, У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. М. Ігнатоўскі. — 5-е выд. — Мн. : Беларусь, 1991. — 190 с.
6. *Брянцев, П. Д.* История Литовского государства с древнейших времён / П. Д. Брянцев. — Вильно : [б. и.], 1889. — 659 с.
7. *Коялович, М. О.* Лекции по истории Западной России / М. О. Коялович. — М. : [б. и.], 1864. — 348 с.
8. *Коялович, М. О.* Литовская церковная уния. Исследования : в 2 т. / М. О. Коялович. — СПб. : [б. и.], 1859—1861. — Т. 1—2. — 316 с.
9. *Доўнар-Запольскі, М. В.* Гісторыя Беларусі / М. В.Доўнар-Запольскі. — Мн. : Беларус. энцыкл., 1994. — 510 с.
10. *Латышонак, А.* Нацыянальнасць — беларус / А. Латышонак. — Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2009. — 558 с.
11. *Коялович, М. О.* Чтения по истории Западной России /М. Коялович. — 2-е изд., перераб. и доп. — СПб. : [б. и.], 1884. — 349 с.
12. *Черепица, В. Н.* Михаил Осипович Коялович. История жизни и творчества / В. Н. Черепица. — Гродно : ГрГУ, 1998. — 328 с.
13. Гісторыя Беларусі : падруч : у 2 ч. / Я. К. Новік [і інш.] ; пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. — Мн. : Выш. шк., 2003. — Ч. 1 : Ад старажытных часоў па люты 1917 г. — 416 с.

Материал поступил в редакцию 24.02.2014 г.

Репозиторий БарГУ